# Дзядзька Саша

**Аляксандр Яўгенавіч Міронаў — рускамоўны савецкі і беларускі пісьменнік, чалюскінец, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, вязень фашысцкага рэжыму ў Іспаніі, ганаровы палярнік Савецкага Саюза — для мяне проста дзядзька Саша. Так я і буду называць яго ў сваіх успамінах, якія пішу з вялікай цеплынёй і ўдзячнасцю за былое.**

*Зміцер Давідоўскі*



Калі можна так сказаць, то маё сяброўства з дзядзькам Сашам пачалося з самага майго нараджэння. Мая мама, вядомы ўрач–анколаг Ірына Галубовіч, пазнаёмілася з пісьменнікам яшчэ да вайны, і ўсё маё жыццё ад калыскі праходзіла побач з яго сям'ёй — жонкай Валянцінай Іванаўнай, якая была для мяне цёцяй Валяй, дачкой Кацяй і цешчай Марыяй Дзмітрыеўнай. Колькі сябе памятаю, столькі ж памятаю і іх кватэру на рагу вуліцы Янкі Купалы і праспекта Незалежнасці (тады праспекта імя У. І. Леніна). Гэта была трохпакаёўка. Пакоі былі раздзельныя і размяшчаліся ў адну лінію. Насупраць уваходных дзвярэй знаходзіўся кабінет дзядзькі Сашы, далей — спальня і пакой, у якім некаторы час жыла Марыя Дзмітрыеўна, а пасля яе смерці — дачка Каця. Старэйшы сын Сяргей, таленавіты рэжысёр, і сёння ўзначальвае ў Новасібірску «Тэатр Сонца».

Далёка не кожная сям'я можа ганарыцца такім сяброўствам, якое было у маіх бацькоў з сям'ёй Міронавых. Я мог прыйсці да дзядзькі Сашы ў любы час і без папярэдняй дамоўленасці, а ўжо ад яго патэлефанаваць дамоў і сказаць, дзе я — каб не хваляваліся. Калі ў дзядзькі Сашы ў той час быў іншы наведвальнік, я ішоў на кухню з цёцяй Валяй, і там пілі мы каву ці гарбату — на выбар. Калі трохі пазней дзядзька Саша заходзіў на кухню і бачыў мяне, то заўсёды казаў адну і тую ж фразу: «Ну, прывітанне, Дзімка! Нарэшце дурняў выправадзіў. Трэба зараз і з разумнымі паразмаўляць». Безумоўна, калі яго візіцёрамі былі Ніл Сымонавіч Гілевіч або Генадзь Мікалаевіч Бураўкін, такіх слоў ад яго я не чуў: вельмі высока цаніў дзядзька Саша гэтых паэтаў — як з агульначалавечага, так і з прафесійнага пункту гледжання.

Ён нам прыдумаў прозвішча Галудоўскія: мама па прозвішчы Галубовіч, тата — Давідоўскі, вось і атрымліваліся мы Галудоўскія. У доме Міронавых заўсёды было весела. Дзядзька Саша вельмі любіў тое, што называецца «прыколы», любіў разыгрываць. Мы ж добра адрознівалі яго жарты ад сур'ёзных размоў, а бывалі выпадкі, калі нехта не мог сходу адрозніць, дзе гумар, а дзе сур'ёзна — так па–майстэрску ён свае розыгрышы абстаўляў. Аднойчы адбыўся такі выпадак. У цырк на гастролі прыехала новая трупа. Дзядзька Саша стаяў ля кухоннага вакна і нечакана ўбачыў, як па праспекце вядуць сланоў. Выглядала гэтае шэсце наступным чынам: спераду ішоў слон–бацька, за яго хвост хобатам зачапілася сланіха, а за яе хвост — сланяня. Дзядзька Саша пачаў клікаць




Мемарыяльная дошка на лецішчы А. Я. Міронава ў Кактэбелі.



Александр Міронаў з Янкам Маўрам. Кактэбель, 1956 год.

сваіх паглядзець на гэты цуд, а тыя без усялякіх эмоцый яму адказалі: «Ну вядуць, і хай вядуць». І толькі мо з пятнаццатага разу зразумелі, што гэта праўда, але ўбачылі самы канец гэтага шэсця. Так звыкліся з розыгрышамі, што і ў такую рэдкую з'яву паверылі не адразу.

Памятаю свой першы прыезд на іх лецішча ў Кактэбелі. Гэта быў 1981 год, завяршыўся першы год маёй працы ў бібліятэцы. Прыехалі туды мы ўсёй сям'ёй: я, мая сястра Маша, тата і мама. І вось дзядзька Саша вырашыў паказаць нам Казіную бухту. Мы ўсе добра ведалі, што там размешчана нейкая ваенная база, і простаму чалавеку туды нельга трапіць. Простаму, але не дзядзьку Сашы. Ён дамовіўся з дырэктарам Літфонда, і той павёз нас на ўласным аўтамабілі «шэрага колеру маркі ГАЗ–24м "Волга"». Куды мы едзем, дзядзька Саша сказаў яму толькі ў дарозе. Паварочваць назад было позна. Наш кіроўца сказаў тады: «Под твою ответственность, Сашка». Той, як заўсёды, пажартаваў, што яму гэта не першы раз. Так пад'ехалі да шлагбаума вайсковай часці. Зразумела, што перад носам нашай машыны шлагбаўм апусцілі. Дзядзька Саша дастаў сваё пасведчанне і з грозным выглядам дакладным страявым крокам падышоў да вартаўнікоў, рэзка разгарнуў пасведчанне і па–вайсковаму скамандаваў: «Открыть». І такім жа дакладным страявым крокам пайшоў да аўтамабіля… У выніку шлагбаўм узмыў уверх. Мы добра адпачылі ў Казінай бухце: купаліся, збіралі сердалікі і іншыя паўкаштоўныя камяні, якія тады выкідалі марскія хвалі на бераг. І паехалі назад у Кактэбель. Гэтае здарэнне мы ўспаміналі з усмешкай пасля вяртання ў Мінск.

На лецішчы была так званая летняя кухня, дзе мы снедалі, абедалі і вячэралі. Аднаго разу пасля вячэры дзядзька Саша пачаў чытаць на памяць вершы Веры Інбер. Чытаў ажно да сярэдзіны ночы. Трэба сказаць, што чытальнік з яго быў выдатны, як, дарэчы, і акцёр. І хоць мне вершы гэтай паэтэсы не вельмі падабаюцца, у яго выкананні яны гучалі цудоўна. Праўда, нават майстэрскае чытанне не прымусіла мяне палюбіць паэзію Веры Інбер.

Перпендыкулярна вуліцы, на якой стаяў кактэбельскі дом дзядзькі Сашы, праходзіла вуліца з лецішчамі Марыэты Сяргееўны Шагінян, яе дачкі Мірэлі Якаўлеўны Шагінян і яе ўнука Сяргея Віктаравіча Цыгаля: спачатку дом Сяргея, потым — Мірэлі, а за ім — і самой Марыэты Сяргееўны. Гэта былі міні–музеі армянскай культуры, побыту і гісторыі. Цёця Валя вадзіла мяне па гэтых дамах. Уражанняў засталося на ўсё жыццё. На вялікі жаль, Марыэты Сяргееўны ўжо даўно не было ў жывых, і таму сустрэцца з гэтым цікавым чалавекам не давялося, а дачка і ўнук ездзілі туды вельмі рэдка. Трапіць у дамы без гаспадароў удалося толькі таму, што ключы ад гэтых дамоў мелі суседзі Міронавых, якія сачылі і за лецішчам дзядзькі Сашы, калі ён са сваёй сям'ёй жыў у Мінску.

Аднойчы на той самай летняй кухні адбылася сустрэча з Народным артыстам Расійскай Федэрацыі Сямёнам Фарадой. Трэба сказаць,



Цёця Валя, дзядзя Саша і маці аўтара артыкула Ірына Галубовіч.

што Сямён Львовіч у жыцці быў такі ж, як і на сцэне. Дзядзька Саша з Фарадой травілі анекдоты, расказвалі жарты, і, зноў жа, немагчыма было зразумець, ці ў рэальнасці ўсё было так, ці гэта былі іх фантазіі. Але ў абодвух вочы свяціліся ад радасці і ўсмешак. У Міронавых была добрая традыцыя: вось так пасядзець на летняй кухні пасля вячэры, з гасцямі ці проста сваёй кампаніяй. Вельмі любіў дзядзька Саша ўспамінаць пра сваё марское мінулае. Яго расповеды, як заўсёды, пранізваліся гумарам і мелі акцёрскае выкананне. Ён дакладна імітаваў галасы капітана «Чалюскіна» Уладзіміра Іванавіча Вароніна, навуковага кіраўніка экспедыцыі Отта Юльевіча Шмідта і іншых. У сваёй вінаграднай альтанцы дзядзька Саша расказаў мне выпадак, які адбыўся з Вароніным на «Чалюскіне». У той дзень Аляксандр Міронаў быў днявальным, стаяў на вахце. Сваім пільным вокам ён заўважыў матроса, які, хістаючыся так, быццам выпіў дзве бутэлькі гарэлкі, выйшаў з каюты і пачаў спраўляць малую патрэбу проста на палубе. Марская хвароба была ў самым разгары. І вось Варонін, якраз падчас чарговага абхода карабля, заўважыў такую карціну. Быццам мімаходам, ён кінуў фразу сваёй гаворкай: «По што с… на палубу? По весне душына будет». І спакойна пайшоў далей. Тут адбылося неверагоднае: пасля гэтых слоў капітана «Чалюскіна» малады чалавек, як той сабака, што вылез з ракі, абтроссяе, перасмыкнуў плячыма, нібыта на яго вылілі цэбар вады з Паўночнага Ледавітага акіяна, — і вярнуў сабе нармальнае аблічча. Гэтая гісторыя была мне расказана як прыклад таго, што сардэчнае слова можа вылечыць чалавека.

Лецішча дзядзькі Сашы было вельмі добра спраектавана: дрэвы пасаджаны так, што нават у самую невыносную спёку ў садзе стаяла прыемная прахалода:+20–25 замест +35–40. У сярэдзіне яго батанічнага сада (а на яго ўчастку раслі даволі экзатычныя дрэвы — граб, шалковіца і іншыя, усіх і не памятаю) стаяла альтанка з жывой вінаграднай лазы. У ёй — самаробныя лаўкі і стол. Я вельмі любіў бавіць час з ім у гэтай альтанцы. Размаўлялі і ласаваліся вінаградам. У адзін з такіх вінаградна-альтанкавых вечароў дзядзька Саша расказаў мне пра тое, як ён трапіў у франкісцкую турму.

Дзядзька Саша быў капітанам гандлёвага судна «Смідовіч», у трумах якога знаходзілася, як сёння кажуць, гуманітарная дапамога іспанскім паўстанцам супраць рэжыму Франсіска Франка: вопратка, матрацы, коўдры, тушонка і іншае. Ніякай зброі на борце не было. Па непісаным законе нашы караблі, калі ўваходзілі ў іспанскія воды, выключалі сігнальнае асвятленне, каб не трапіць у франкісцкі палон. Але гэта нячаста дапамагала. Перад тым, напрыклад, знік экіпаж гандлёвага судна «Камсамолец» (потым гэтак жа назвалі атамную субмарыну, якая затанула ў Баранцавым моры: быў парушаны спрадвечны марскі закон, які забараняе называць новыя караблі імёнамі тых, хто загінуў). Тое ж адбылося з камандай дзядзькі Сашы. Карабель адбуксіравалі ў спецыяльны бокс для мытнай праверкі, а экіпаж накіравалі ў турму ў Мадрыдзе. Узначальваў тую турму кат Хасе Харэра, якога дзядзька Саша ахрысціў




Хадзячай Халерай. Дзядзька Саша не дазволіў гэтаму кату доўга здзекавацца з хлопцаў. І ў адзін момант, калі ў іх камеру прыйшоў Хадзячая Халера, ён даў адпаведны знак, пра які было загадзя дамоўлена, — і ўся каманда адмалаціла гэтага ката, за што была пераведзена на плавучую турму, ратунак з якой — толькі смерць. Тут дзядзька Саша і сустрэў каманду «Камсамольца», якую даўно лічылі загінулай. Плавучая турма накіравалася ў свой порт прыпіскі на поўдні Іспаніі, дзе тэрыторыю кантралявалі немцы. Дзядзька Саша адразу правільна ацаніў становішча і паведаміў свой план уцёкаў. Гэты план мог быць рэалізаваны толькі ў тым выпадку, калі б у порце прыпіскі плавучай турмы знаходзіўся савецкі хуткасны карабель. На сярэдзіне маршрута змяніліся канвой і варта з іспанскай на нямецкую. Усё ішло па плане. Калі карабель–турма прыбыў у порт прыпіскі, вязні сышлі на бераг. Немцы, на сваю бяду, селі абедаць і піць свой шнапс у звыклы для іх час, а дзядзька Саша сваім пільным вокам заўважыў савецкі хуткасны сухагруз пад парамі. Ён падаў адпаведны марскі знак капітану карабля, і той даў загад прытрымаць трап. Абедзве каманды ўбачылі ўмоўны сігнал і пабеглі ў бок савецкага карабля, ўзляцелі па трапе на яго палубу. А дзядзька Саша куляй ўскочыў у капітанскую рубку і даў каманду: «Полный вперёд». Праз лічаныя хвіліны карабель апынуўся ў нейтральных водах. Абедзве каманды былі выратаваныя. Калі немцы апамяталіся, савецкі карабель з вязнямі плавучай турмы знік за гарызонтам. Так дзядзька Саша вярнуў на Радзіму абедзве каманды — сваю і «Камсамольца». За гэты ўчынак ён быў узнагароджаны, калі не памыляюся, ордэнам «Чырвонай зоркі».

А напрыканцы мне вельмі хочацца расказаць пра тое, як дзядзька Саша дапамог мне ўзнавіць добрыя адносіны з аднагрупнікамі. Пасля першых дзвюх сесій неяк вельмі хутка пачалі яны пагаршацца. Я ўжо не памятаю, што стала таму прычынай, але перажываў вельмі балюча. Прыйшоў у сваім падаўленым стане да дзядзькі Сашы. Той адразу: «Расказвай, што здарылася. Я добра бачу, што нешта ў цябе кепска ў інстытуце». Адпірацца было нельга. І я расказаў дзядзьку Сашу ўсё без утойвання. Ён сказаў, што можа прыйсці да мяне ў групу на куратарскую гадзіну. Даволі хутка з'явілася і нагода — 23 лютага. Наш куратар папрасіў запрасіць ветэрана вайны, я праявіў ініцыятыву, дамовіўся з дзядзькам Сашам і ў прызначаную гадзіну сустрэў яго ў холе інстытута, прывёў у аўдыторыю. Можаце сабе ўявіць твары маіх аднагрупнікаў, калі ў адыторыю ўвайшоў стройны пажылы чалавек у форме марскога афіцэра са шматлікімі вайсковымі ўзнагародамі? Дзядзька Саша пачаў распавядаць пра чалюскінскую экспедыцыю 1933–1934 гадоў, пра лядовы лагер Шмідта, пра тое, як было арганізавана выратаванне каманды «Чалюскіна». Як матросы з «Чалюскіна» трапілі да чукоціх эскімосаў, а ўжо адтуль — у Маскву. З лядовага лагера каманду вывозілі лётчыкі–асы Анатоль Ляпідзеўскі, Маўрыкій Сляпнёў, Васіль Молакаў, Мікалай Каманін, Міхаіл Вадап'янаў і Іван Даронін. Усе яны сталі Героямі Савецкага Саюза. У вельмі складаных умовах імі было выканана 24 авіярэйсы. Усіх маіх аднагрупнікаў вельмі ўразілі як подзвіг саміх чалюскінцаў, так і подзвіг лётчыкаў, якія ўвесь час рызыкавалі сваім жыццём дзеля выратавання каманды парахода «Чалюскін». У той дзень дзядзька Саша расказаў і пра свае ваенныя паходы. Як заўсёды, яго аповед вылучаўся артыстызмам: удзельнікі падзей былі прадстаўлены ў асобах. Ніхто не чакаў такой цікавай сустрэчы. Пасля яе мае стасункі з аднагрупнікамі наладзіліся.

Вось такі быў мой сябар дзядзька Саша, Аляксандр Яўгенавіч Міронаў. Канешне, я расказаў не пра ўсё. Ды хіба ў адным артыкуле ўсё раскажаш?..